Выдавец:
ІП Уладзімір Скрабатун, пасведчанне №1156 ад 23.04.2004 г., выдадзена Глыбоцкім РВК.
Перыядычнасць – 1 раз на тыдзень,
дзень выхаду – чацвер,
выдаецца на беларускай мове.

Штотыднёвая газета

vglybokaye@tut.by

Вольнае Глыбокае

Выдаецца са снежня 1994 года | 3 (355) 18 студзеня 2007 года. | Кошт 600 рублёў

Хто ўтаймуе гэты «вецер» у галовах грамадзян: апошнім часам зламаныя – скамейка ля дома па вул. Калініна, 41, дзверы пад'ездаў па вул. Леніна, 139 і 139-А, вул. Калініна, 41 (2 і 4 пад'езды), вул. Міра, 3 і 5.

У Беларусі падвышаюцца закупныя цэны на малако і мяса

У Беларусі падвышаюцца закупныя цэны на малако, свінняў і буйны рагаты скот, якія набываюць у сельгасвытворцаў для прамысловай перапрацоўкі, паведаміла карэспандэнту БелТА начальніца галоўнага ўпраўлення эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Ганна Андрыевіч.

Адпаведная пастанова ўрада №1780 ад 30 снежня ўступіць у сілу са дня яго афіцыйнага апублікавання – з 11 студзеня 2007 года.

Закупныя цэны на малако ў сярэднім падвысяцца на 5%. У прыватнасці, малако вышэйшага гатунку будуць прымаць зараз па Br410 тыс. за 1 тону, першага гатунку – па Br382 тыс., другога гатунку – па Br245 тыс.

Закуп свінняў першай катэгорыі будзе выраблівацца па Br3473 тыс. за 1 тону, другой катэгорыі – па Br3358 тыс. На астатнія катэгорыі свінняў закупныя цэны не павялічваюцца.

Закупныя цэны на буйны рагаты скот вырастуць на 10%. Так, маладняк БРС вагай 400 кг і вышэй будзе прымацца па цане Br2923 тыс. за 1 тону, дарослы буйны рагаты скот вышэйшай укормленасці – па Br2360 тыс., маладняк вагай ад 350 да 399 кг – па Br2700 тыс. за тону.

Падвышэнне закупных цэнаў дазволіць часткова кампенсаваць выдаткі на вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі. У прыватнасці, павелічэння закупных цэнаў на буйны рагаты скот адмыслоўцы АПК патрабавалі даўно, бо яго вытворчасць стратна ўжо на працягу некалькіх гадоў. Дадзеная мера накіраваная на фінансавае аздараўленне сельгасгаспадарчых прадпрыемстваў, што ва ўмовах падвышэння цэнаў на газ набывае ўсё большую актуальнасць, адзначыла Ганна Андрыевіч.

Нагадаем, з 1 сакавіка 2006 года закупныя цэны на малако былі павялічаныя ў сярэднім на 5%, з 23 жніўня на буйны рагаты скот – на 10% і свінняў – на 5%

Магазін "Візіт" на Маскоўскай, 11
Ралеты 17-18 ва "Універмагу"
РАСПРОДАЖ зімовага абутку
Час працы: з 9⁰⁰ да 19⁰⁰
субота: 9⁰⁰-17⁰⁰;
нядзеля: 9⁰⁰-15⁰⁰
Ліц. №22150/0283565 ад 07.02.04, выд. Глыбоцкім РВК

КЛЕЙ для блокаў, цэглы, пліткі
На Маскоўскай, 79
ІП Аляхновіч
Тынкоўка. Шпатлёўка
Сухія сумесі, вапна, пячная і сілікатная цэгла, гліняны парашок
І шмат чаго іншага!
Тэл.: 331-21-12, 518-17-29; 2-69-49; 2-72-42
Ліц. №22150/100218, выд. 31.05.04 Глыбоцкім РВК

Усё для дахаў!
Дастаўка
Тэл.: 612-45-50; 595-45-50; 2-69-49
Металадахоўка, наплаўляемыя, катэпал, водасцёкавыя сістэмы
На Маскоўскай, 79
ІП Аляхновіч
Ліц. №22150/100218, выд. 31.05.04 Глыбоцкім РВК

ЧУП "Авто-Забота"
Тэл.: 2-65-94
выканаем ЗВАРАЧНЫЯ РАБОТЫ
якасна і ў кароткія тэрміны
Пасв. № 39038985 ад 22.03.2006 г., выд. Глыбоцкім РВК

Ваша акно ў Свет
Вырабім:
Вокны, вітражы, перагародкі з ПВХ
профіля "Salamander", фурнітура ARTEC (Германія).
Гарантыя абслугоўвання 2 гады.
8(029) 590-70-38; 655-53-39
Падваконнікі і злівы
ДЗВЕРЫ міжпакаёвыя і стальныя
8(029) 513-67-75; 213-55-69; 876-53-39; 8(02156) 2-29-92
Наяўны і безнаяўны разлік
Пасв. №270 ад 20.11.01 Глыбоцкім РВК

Полацкага маньяка прысудзілі да расстрэлу

Да вышэйшай меры пакарання прыгаварыў 9 студзеня полацкі суд 28-гадовага серыйнага забойцу Юрыя Курыльскага. На сумленні гэтага маладога чалавека жыцці трох дзяўчын, адной з якіх было ўсяго 16 гадоў.

Першую ахвяру Курыльскага выявілі яшчэ ў снежні 2004 года ў Глыбоцкім раёне, каля вёскі Булахі. Тое, што гэтая дзяўчына стала ахвярай серыйнага забойцы, стала ясна, калі праз год з розніцай у месяц у Полацкім раёне знайшлі яшчэ два трупы. Як высветлілі эксперты, незадоўга да смерці ўсе тры забітыя дзяўчыны ўступалі ў палавую сувязь з адным і тым жа мужчынам.

Кавалера-забойцу дапамагла выкрыць чорная «Волга», на якой ён запрашаў дзяўчат пакатацца. Такіх аўтамабіляў, як расказаў следчы па адмыслова важных справах Полацкай пракуратуры Яўген Гуляеў, налічваецца не так ужо і шмат. Праверыўшы ўсе машыны, праваахоўныя органы выйшлі на злачынцу. Курыльскі быў жанаты, працаваў апаратарам на «Нафтане». Пры вобыску ў яго выявілі нож са слядамі крыві адной з ахвяраў. Плямы крыві іншай дзяўчыны знайшлі ў салоне той самай «Волгі»... Юрый Курыльскі сваю віну не адмаўляў, але і растлумачыць следчаму, чаму ён забіваў дзяўчат, толкам не змог. Паўтараў нешта аб тым, што яны не дэманстравалі належнай да яго павагі. «На глебе раптам узніклых непрыязных дачыненняў» – напісана ў прысудзе.

Эксперты прызналі серыйнага забойцу псіхічна здаровым. У сваім апошнім слове ён папрасіў прабачэнні ў сваякоў забітых дзяўчат. А калі зачытвалі прысуд, чамусьці ўсміхаўся, паведамляе «КП у Беларусі».

КУХНІ па Вашых памерах
ЗАМЕР. ДАСТАЎКА
Тэлефон: 697-22-18
Тэрмін – 7 дзён!
Кухонныя вугалкі
Ліц. №42365/0296288, выд. 18.12.2006 г. Гродзенскім АВК

Магазін "Майстар"
Тэлефон: 2-83-09
Заўсёды ў наяўнасці
на Чырвонаармейскай, 78-А
Панэлі ПВХ
МДФ
250 мм белыя і каляровыя, ПВХ 10 см белыя
Гіпсакардон.
Ліцэнзія №22150/1002032 ад 15.04.04 г., выд. Глыбоцкім РВК

19 студзеня – Вадохрышча

«БУДЗЬ ЗДАРОЎ, ЯК ВАДА»

Паводле старажытных уяўленняў нашых продкаў, вада была адной з самых першых стыхій, якая панавала ў свеце. Са з'яўленнем хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях сталі выконваць абрад асвячэння вады, г.зн. «прызывання на ваду Божага блаславення». У ваду тры разы запар апускаюць крыж і чытаюць адпаведныя малітвы. «Святую», ці асвечаную, ваду надзяляюць жыццядайнымі якасцямі пазбаўлення ад хвароб, ачышчэння, аховы і Божага блаславення, працягваючы верыць у магію «жывой» вады.

Самым галоўным днём асвячэння вады стаў дзень 19 студзеня — Хрышчэнне Гасподняе, ці Богаяўленне, калі адбываецца «Вялікае асвячэнне вады». Асвечаная ў гэты дзень вада, якая называецца святой, іарданскай, хрышчэнскай, богаяўленскай, лічылася найбольш здаровай, гаючай, здольнай засцерагчы чалавека ад хвароб.

Лічыцца, што ў свята Богаяўлення вада асвячаецца не толькі ў храмах, але і ў рэках, крыніцах, азёрах, калодзежах. Паводле народных уяўленняў, Ісус Хрыстос апускаецца на зямлю, каб акунуцца ў святую ваду.

Паўсюдна вернікі разам са святарамі наладжвалі «ход на Іардань». У бліжэйшым вадаёме рабілі палонку ў выглядзе крыжа, якую звалі Іардань. Шлях да «Іардані» ўсцілалі саломай, абапал яго ставілі ўпрыгожаныя стужкамі і кветкамі маладыя елачкі. Верылі, што сама палонка і месца вакол яе валодаюць цудадзейнай сілай. Пасля набажэнства каля «Іардані» ў ёй абавязкова купаліся: хворыя — каб пазбавіцца ад хваробы, а тыя, хто хадзіў пераапранутым у Новы год, калядоўшчыкі, тыя, хто варажыў, — каб пазбавіцца ад граху. Ад асвечанай вады, лічылі, нельга захварэць нават у самыя моцныя маразы.

"Хрышчэнскую ваду захоўвалі на працягу года і выкарыстоўвалі ў лекавых і магічных мэтах. Цікавы феномен: вада, якую ўзялі 18—19 студзеня, не псуецца на працягу 3 гадоў.

Вялікім грахом лічылася ў дзень асвячэння вады апаганьваць яе: мыцца, мыць бялізну, займацца бруднай работай, якая непасрэдна звязана з выкарыстаннем вады. Каб не парушаць гэтай забароны, ваду для бытавых патрэб нарыхтоўвалі ў неабходнай колькасці загадзя.

Асвечанай вадой лячылі шматлікія хваробы (асабліва сурокі), асвячалі (абпырсквалі) хату і гаспадарчыя пабудовы на двары. «Святую» ваду выкарыстоўвалі і ў сямейнай абраднасці: пры першым рытуальным купанні дзіцяці, перад тым, як маладыя паедуць пад вянец, і г.д.

Янка Крук

Прадухілена замоўленае забойства прадпрымальніка

■ **Таццяна Чабатарова,** *БелаПАН*

Супрацоўнікі ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Віцебскай вобласці прадухілілі замоўленае забойства прадпрымальніка.

Як паведаміла супрацоўнік прэс-службы УКДБ Наталля Макарава, жыхар Віцебска 1985 года нараджэння шукаў магчымасць забіць камерцыйнага кампаньёна, свайго блізкага сваяка. Маючы на мэце завалодаць грашовымі сродкамі, што ўклаў прадпрымальнік у сумесную справу, замоўца забойства заплаціў кілеру 2.000 долараў ЗША.

«Злачынства павінна было адбыцца ў пад'ездзе дома па вуліцы Гагарына ў Віцебску, дзе жыла патэнцыяльная ахвяра. Замоўца быў затрыманы непасрэдна на месцы падрыхтоўкі злачынства аператыўнай групай УКДБ па Віцебскай вобласці сумесна з супрацоўнікамі спецпадраздзялення «Альфа», - сказала Н.Макарава.

Па гэтым факце пракуратура Віцебскай вобласці распачала крымінальную справу па частцы 1 артыкула 13 (падрыхтоўка да злачынства) і пункце 12 часткі 2 артыкула 139 (забойства з карыслівых мэтаў або па найме) Крымінальнага кодэкса, якія прадугледжваюць максімальнае пакаранне ў выглядзе пажыццёвага зняволення або смяротнага пакарання.

Браслаўскі раён

Непрыемнае суседства, але непазбежнае

■ Станіслаў Раманчук

Імкнучыся супакоіць сваіх суседзяў, прадстаўнікі літоўскага боку прынялі запрашэнне і актыўна ўдзельнічалі нядаўна ў Браславе на прайшоўшых грамадскіх слуханнях па ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе могільніка радыёактыўных адходаў паблізу Ігналінскай АЭС.

У гэтым мерапрыемстве ўдзельнічалі каля 200 чалавек, якія прадстаўлялі розныя калектывы і арганізацыі азёрнага краю. Саму атамную станцыю ў Літве плануюць закрыць поўнасцю ў 2009 годзе, але яна, па словах намесніка дырэктара агенцтва па абыходжанню з радыёактыўнымі адходамі А. Войдатаса, цяпер уяўляе нашмат большую небяспеку, чым той могільнік, які будзе пабудаваны па сучасных тэхналогіях. Літоўцы абверглі чуткі, што ў гэта збудаванне будуць звозіцца падобныя адходы з усёй Еўропы. Надзейнасць такой пабудовы, якая разлічана на 300 гадоў эксплуатацыі, дасягаецца дзякуючы прымяненню прынцыпаў шматбар'ернасці. Пакуль нявырашаным застаецца пытанне аб выбары месца будаўніцтва для могільніка з трох варыянтаў, магчыма, на некаторым аддаленні ад беларускай мяжы. Дарэчы, у самой Беларусі плануюць узвесці ўласную АЭС і нам у перспектыве таксама не абысціся без такога могільніка.

Пастаўскі раён

Плюс лесапільны завод

■ Кастусь Александровіч

Летась самы малады ў рэгіёне працоўны калектыў прыватнага прадпрыемства "Пастаўскі мэблевы цэнтр" стаў пераможцам абласнога і рэспубліканскага конкурсу "Лепшы прадпрымальнік года" ў намінацыі" За стварэнне новых рабочых месцаў".

Цяпер на Пастаўшчыне гэта адзін з буйнейшых суб'ектаў гаспадарання з колькасцю звыш 600 чалавек, працаўладкавацца куды імкнуцца многія. Свабодных вакансій, праўда, практычна няма, але хутка на гэтым сучасным прадпрыемстве іх прыбавіцца. Неўзабаве ў студзені з Германіі будзе завезена абсталяванне для высокапрадукцыйнага лесапільнага завода. На ім на аўтаматызаваных лініях пачнуць працаваць яшчэ 20 чалавек. Магутнасці завода дазваляюць перапрацоўваць у суткі ад 4 і болей вагонаў лесу, якія штодзённа паступаюць сюды па чыгунцы. Летась мэблевы цэнтр дасягнуў найбольшага ў раёне росту вытворчасці, выпускаючы якасныя дзверы 12 найменняў, вокны і шклопакеты. Рэнтабельнасць асноўнай вытворчасці дасягнула 17%, у 2006 годзе тут увялі ў эксплуатацыю новы цэх дрэваапрацоўкі па безадходнай тэхналогіі. Арыентацыя па прагрэсіўнай тэхналогіі дазваляе пастаўчанам прадаваць сваю прадукцыю ўжо больш чым у 20 краінах свету.

Докшыцкі раён

Дзе чарка, там людскія беды

■ Чэслаў Якубовіч

Сапраўдным сацыяльным злом у нашай краіне стала апошнім часам цяга да спіртнога значнай часткі насельніцтва і рост самагонаварэння.

Не стаў выключэннем і Докшыцкі раён, хоць тут, у адрозненне ад суседзяў, пакуль фактаў масавых захворванняў таксічным гепатытам не назіралася. Але напрыканцы года ў Бярэзінскім краі міліцыяй выяўлена 14 ачагоў самагонаварэння. Акрамя іх аператыўнікі знайшлі і абясшкодзілі яшчэ два цэлых міні-заводы па вырабу гарэлкі, вылілі на зямлю больш за тры тоны дурманячай вадкасці. З гэтым злом трэба змагацца актыўна, бо на глебе частых застолляў усё часцей узнікаюць дзікія сямейныя спрэчкі і бойкі. Горш таго, у раёне толькі за мінулы год у дамах грамадзян зафіксавана 39 розных крымінальных злачынстваў, падчас такіх скандалаў даходзіла да катавання сваіх блізкіх і пагроз забойства. Самай неабароненай катэгорыяй становяцца дзеці. У прыватнасці, летась у краіне праз мясцовы дзіцячы прытулак прайшлі 39 хлопчыкаў і дзяўчынак, з якіх толькі 16 дзяцей вярнуліся ў родныя сцены, калі іх бацькі нарэшце дадумаліся, да чаго яны апусціліся.

Скраў... камандны пункт

■ Сяргей Буткевіч

Мову адняло ў камандзіра палка сувязі, які дыслакуецца ў Лепельскім раёне, калі ён, прыехаўшы на свой камандны пункт, на звыклым месцы яго не знайшоў.

Калі б знакаміты замежны ілюзіяніст Дэвід Коперфілд наведаў Лепельшчыну, то даведаўся б, што там у яго з'явіўся паслядоўнік. Толькі ў адрозненне ад англічаніна, які дэманструе знікненне вагонаў і нават шматпавярховых дамоў, ягоны беларускі калега ўчыніў знікненне вайсковага аб'екта.

Чалавека, які "дапамог" КП знікнуць, міліцыянеры знайшлі хутка. 35-гадовы мясцовы прадпрымальнік прызнаўся следчаму, што вельмі смуткаваў гледзячы, як пакрысе разбураецца ад снегу і дажджу закансерваваны яшчэ гадоў 10 таму будынак. А яму, маладому бізнесмену, якраз востра патрабаваліся будматэрыялы. Вось ён з дапамогай сяброў забраў сабе тое, што, на ягоную думку, нікому ўжо не належала. А вывез ён, разабраўшы КП, 33 падмуркавыя блокі і 6 жалезабетонных пліт. Вайскоўцы ж лічаць, што малады чалавек – самы сапраўдны злодзей, які нанёс палку сувязі страты ў суме 400 тысяч рублёў. Следчыя салідарныя з вайскоўцамі. Так што прадпрымальніка-ілюзіяніста чакае суд за крымінальнае злачынства, а не ганарар за фокус.

Надвор'е ў Глыбокім http://www.rp5.ru

	чацвер 18.01.07				пятн.19.01.07		суб.20.01.07		нд.21.01.07		пн.22.01.07
Мясцовы час	2:00	08:00	14:00	20:00	02:00	14:00	2:00	14:00	2:00	14:00	2:00
Хмарнасць											
Ападкі											
Ціск, мм	741	735	732	725	709	717	730	742	736	732	733
Тэмпература, °C	+5	+6	+6	+4	+8	0	-3	-2	0	+5	+2
Вільготнасць, %	94	90	92	93	92	88	87	89	99	-	-
Вецер м/сек	Пд-З 6	Пд-З 8	Пд-З 6	Пд-З 4	Пд 9	Пн-З 10	Пн-З 8	Пн-З 5	Пд 7	З 8	З 8

Дзень за днём

Сёлетняя зіма працягвае ставіць рэкорды анамальна цёплых тэмператур, бо студзень у краіне стаў падобны на красавік. У нас зацвілі кветкі, французы на поўдні купаюцца, як летам, амерыканцы загараюць на сонцы. У Беларусі спакойна завяршыліся выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. У нашай краіне, а таксама ў свеце большае хваляванне выклікала чарговае абвастрэнне "газанафтавага канфлікту" і часовае спыненне паставак газу ў шэраг еўрапейскіх дзяржаў.

Інцыдэнт тыдня

Толькі пасля працяглай тэлефоннай размовы прэзідэнтаў А. Лукашэнкі і У. Пуціна сітуацыя вакол паставак стратэгічнага паліва ў Еўропу супакоілася. Беларускаму боку прыйшлося адмовіцца ад мытнага афармлення, праўда, пры ўмове, што і расіяне пераглядзяць стаўку сваёй вывазной мытнай пошліны. У адваротным выпадку для Беларусі мог хутка наступіць чорны дзень для ўсёй эканомікі, бо выйграць гандлёвую і інфармацыйную вайну супраць свайго магутнага і багатага суседа нашай невялікай краіне было нерэальна. На жаль, апынуўшыся ў стане абвастрэння адносін, абедзве краіны падпорцілі і імідж надзейных партнёраў. Ад расійскага газу ўжо адмовіліся Азербайджан, Грузія, а яшчэ раней і Украіна.

Адкрыццё тыдня

На фоне гэтага канфлікту ў Беларусі пачалі дзейнічаць адразу тры электрастанцыі, якія пачалі выпрацоўваць энергію з мясцовых відаў паліва. На старэйшай у краіне БелГРЭС запусцілі ў эксплуатацыю паравы кацёл і турбіну магутнасцю 1.5МВт. У Пінску на цеплаэлектрацэнтралі пачалі працаваць два катлы з лясных адыходаў на 10 тон пару ў гадзіну. Яшчэ адзін падобны кацёл уведзены ў кацельні ў Вілейцы. Зразумела, магутнасць такіх станцый мізэрная, але гэта толькі пачатак вялікай працы па развіццю ў Беларусі альтэрнатыўнай энергетыкі з разлікам, што да 2012 года ў краіне будзе выпрацоўвацца энергіі пятая частка з мясцовага паліва. Але без будаўніцтва ўласнай АЭС Беларусі не абысціся.

Кампраміс тыдня

З пачатку года пасля адмовы расійскіх мытнікаў афармляць беларускі цукар прамыя страты айчынных заводаў-вытворцаў салодкай прадукцыі перавысілі 2 мільёны долараў. Панесла адчувальныя страты і Беларуская чыгунка. Толькі перад Каляднымі святамі расійскі бок адмяніў свае жорсткія меры, і зноў пачалося афармленне нашага цукру на Траякураўскім мытным пасту ў Маскве. Гэта тым больш дзіўна, паколькі са 100 расійскіх цукровых заводаў толькі 5 працуюць на ўзроўні якасці вырабаў 4 нашых, якія мелі дамову на пастаўку ў Расію больш за 350 тысяч тон цукру.

Засмучэнне тыдня

Пасля апублікавання ўказа № 760 колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў у Беларусі сёлета можа істотна скараціцца. Згодна з патрабаваннямі гэтага дакумента, многім дробным бізнесменам прыйдзецца згарнуць сваю дзейнасць, альбо панесці дадатковыя буйныя расходы на перааформленне якасці юрыдычных асоб. З гэтага года прадпрымальнікам забаронена выкарыстоўваць працу наёмных работнікаў, за выключэннем толькі найму сваякоў у колькасці 3-х чалавек. На справе актыўных грамадзян прымушаюць займацца толькі індывідуальнай працоўнай дзейнасцю, прайграючы ў канкурэнтнай барацьбе буйному капіталу.

Знаходка тыдня

Адразу 2 небяспечных сховішчы боепрыпасаў прыйшлося абясшкодзіць за адзін дзень ваенным сапёрам у Полацкім раёне. Адно з іх было знойдзена паблізу вёскі Юровічы, дзе ў зямлі ляжалі 14 снарадаў і 5 мін. Яшчэ большы арсенал адшукаўся каля вёскі Верхачэнне ў складзе 26 снарадаў і 2 гранат. Усе гэтыя боепрыпасы вывезлі ў бяспечнае месца і ўзарвалі.

Дакумент тыдня

Больш за 40 мільярдаў рублёў склала на канец года пратэрмінаваная запазычанасць кватэраздымшчыкаў Беларусі за жыллё і камунальныя паслугі. На такую суму яшчэ налічвалася пеня, але, згодна з рашэннем урада, такім даўжнікам даецца шанец выправіць сітуацыю і пры пэўных абставінах ім спішуць пеню. Пры ўмове пагашэння асноўнага доўгу за паслугі ЖКГ неплацельшчыкі павінны напісаць адпаведную заяву, і на працягу месяца мясцовыя ўлады могуць вырашыць "абнуліць" штрафныя санкцыі з мэтай зніжэння колькасці даўжнікоў.

Трагедыя тыдня

На тэрыторыі былой ваеннай часці паблізу вёскі Зябраўка Гомельскага раёна нядаўна загінулі двое хлопцаў ва ўзросце 15 і 17 гадоў. У кампаніі з яшчэ адным сваім сябрам 14 гадоў яны паспрабавалі разабраць на цэглу пусты двухпавярховы будынак. Але пад час такой працы канструкцыя рухнула і прыціснула насмерць падлеткаў. Пашанцавала толькі аднаму з іх, які ў той момант не знаходзіўся побач.

Адстаўка тыдня

У дзень свайго магчымага заступлення на пасаду добраахвотна падаў у адстаўку 67-гадовы арцыбіскуп Варшаўскі, кардынал Станіслаў Велгус. Прычынай такога рашэння стала тое, што ў 1970 годзе гэты святар падпісаў дамову аб супрацоўніцтве з сакрэтнымі пракамуністычнымі спецслужбамі. Польскі КДБ патрабаваў ад ксяндза пастаўляць інфармацыю аб дзейнасці сваіх калег за мяжой. Новы Папа Рымскі Бенедзікт XYI прыняў адстаўку свайго бліжэйшага паплечніка, а раней у Польшчы вымушана была падаць у адстаўку па падобнай прычыне віцэ-прэм'ер і міністр фінансаў Зіта Гілоўска.

Дасягненне тыдня

Упершыню ў гісторыі беларускага спорту хакейны клуб "Юнацтва" (Мінск) стаў пераможцам еўрапейскага Кантынентальнага Кубка. На турніры, які праходзіў у Венгрыі, наша каманда здолела перамагчы моцных сапернікаў з Фінляндыі, Расіі і дружыну гаспадароў. Дагэтуль мацнейшыя беларускія хакейныя клубы тры гады запар не траплялі нават у фінальны тур Кантынентальнага кубка.

Учынак тыдня

75-гадовы пенсіянер з Магілёва, які гуляў у "Суперлато", здолеў выйграць у ёй дарагі аўтамабіль і "джэк-пот". Пажылы чалавек потым яшчэ раз здзівіў усіх, калі вырашыў перадаць дабрачыннай арганізацыі "Дзіцячы хоспіс" у абласным цэнтры буйную суму ў 3 мільёны рублёў. Свой учынак добры чалавек растлумачыў, што такім чынам ён вырашыў падтрымаць дзетак, якія маюць патрэбу і апынуліся ў бядзе.

Служба інфармацыі "ВГ"

Нафтаперапампоўваючая станцыя «Гомель» нафтаправода «Дружба».
Photo.ByMedia.net

Лічба нумара

100 долараў за 1 тысячу кубічных метраў прыроднага газу, як усе ведаюць, такі зафіксаваны канчатковы варыянт кошту гэтага газу для Беларусі пры пастаўках з Расіі ў 2007 годзе. Зразумела, такое павышэнне сур'ёзна пагаршае ўмовы дзейнасці айчынных вытворцаў. Але нікуды ад такога рэзкага павышэння нам не дзецца, бо і нашы суседзі пачынаюць пераход на рыначныя ўмовы фарміравання цэн на газ па еўрапейскіх прынцыпах цэнаўтварэння.

Не трэба нервавацца з такой нагоды, бо ў параўнанні з іншымі былымі савецкімі рэспублікамі Беларусь атрымала самыя льготныя ўмовы. Нават для іншага саюзніка і сябра Арменіі расіяне ўстанавілі цану ў 110 долараў. Нам адвялі пераходны тэрмін для адаптацыі да рыначных цэн працягласцю ў 4 гады. Пры гэтым штогод Расія абавязалася пералічваць беларусам "жывымі грашамі" па 625 мільёнаў долараў уключна да 2011 года ў залік аплаты акцый "Белтрансгазу". Праўда, ужо ў 2008 годзе цана на газ для Беларусі будзе складаць 111 долараў, а ў далейшым будзе штогод павялічвацца яшчэ на 11 долараў.

Згодна з падпісаным амаль пад бой курантаў кантрактам, 1 студзеня 2011 года яна складзе **104** долары за тысячу кубічных метраў. Аднак беларускі бок разлічваў цэны на газ для Смаленскай вобласці. Такія абставіны ўшчыльную падштурхоўваюць кіраўніцтва краіны для правядзення непапулярных рыначных рэформаў і ажыццяўлення істотнай лібералізацыі беларускай эканомікі. Вядома, што адным з крокаў па мінімізацыі наступстваў павелічэння цэн на энерганосьбіты з'яўляецца шырокае прымяненне працэдуры банкруцтва ў адносінах безнадзейных заводаў і фабрык і курс на развіццё прыватнага сектара. Але гэта азначае адмову ад цяперашняй эканамічнай палітыкі, наўрад ці пойдуць улады на такія меры.

У любым выпадку перамены наспелі. Інакш не пазбегнуць, як пішуць многія аналітыкі і эканамісты, у далейшым пагаршэння жыццёвага ўзроўню. Пакуль жа прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі афіцыйна заявіў, што і 100 долараў для беларускай эканомікі – цана "непад'ёмная", складаная. Асабліва цяжка прыйдзецца сёлета беларускім прадпрыемствам машынабудавання, сельгасмашынабудавання, аптычнага машынабудавання, сельскагаспадарчай вытворчасці. Такая газавая праблема для нашай краіны азначае, што Беларусі спатрэбіцца ў 2007 на гэтыя мэты знайсці дадаткова суму ў 1 мільярд рублёў.

Засмучае тое, што яшчэ больш складаным чым газ, для нас стала пытанне нафты, асабліва пасля ўвядзення расіянамі пошліны ў 180 долараў на нафту, якая экспартуецца ў Беларусь. Тут ужо страты дасягаюць, калі ў гэтым пытанні не знайсці разумных кампрамісаў для абодвух бакоў, на суму ў 3-4 мільярды долараў. Што і сказаць, назіраючы за апошнімі падзеямі і спыненнямі пракачкі нафты ў Еўропу, становіцца трывожна за далейшае развіццё сітуацыі. Новыя цэны на энерганосьбіты, сцвярджаюць дасведчаныя эксперты, без дзяржаўнай падтрымкі не вытрывае кожнае наша чацвёртае прадпрыемства, яшчэ столькі стануць працаваць без прыбыткаў з нулявой рэнтабельнасцю. У такім выпадку можна спрагназаваць праблемы з наяўнасцю абаротных сродкаў, выплатай падаткаў, пагашэннямі банкаўскіх крэдытаў. А з Расіяй трэба ўсё ж дамаўляцца, бо самае непрыемнае, калі яна пойдзе на абмежаванне паставак тавараў з Беларусі. Тым часам беларускі лідэр Аляксандр Лукашэнка ў Свята-Духавым кафедральным саборы зрабіў важнейшую заяву, што Беларусь не адмовіцца ад суверэнітэту і незалежнасці. Да таго ж апошнія два гады былі самымі паспяховымі для беларускай эканомікі, а "беларуская мадэль" развіцця разглядалася, як самая прадуктыўная на прасторах СНД. Зараз жа ёй належыць здаць складаны экзамен і пастарацца захаваць свае канкурэнтназдольныя пазіцыі на расійскім і іншых рынках. З цягам часу стануць вядомыя адказы на многія ўзнікшыя сёлета пытанні.



Г. Мазыр. Тут захоўваюцца запасы нафты.
Photo.ByMedia.net

Магазін бытавой тэхнікі
abc
прапануе
Адрасы магазінаў "abc" у Глыбокім:
вул. Маскоўская, 8а (насупраць гатэлю), тэл.: 2-34-10
вул.Леніна, 7а (за рэстаранам), тэл.: 2-11-55
Заўсёды ў наяўнасці шырокі выбар бытавой тэхнікі:
Халадзільнікі, газавыя пліты, пральныя машыны, СВЧ-печы, пыласосы, прасы, фены, электрачайнікі, кававаркі, абагравальнікі, воданагравальнікі. Тэлевізары, музычныя цэнтры, DVD, DVD-тэатры, аўтамагнітолы, аўтаакустыка, радыётэлефоны, відэакамеры, лічбавае фотаапараты, тумбы пад TV.
Продаж у крэдыт тэрмінам да 6 мес!!!
Бясплатная дастаўка! Продаж па чэках!!!
Гарантыя да 5 год!
Самыя нізкія кошты толькі ў нас
Прыходзьце, будзем вам рады

Памяць выгнання з волі

Марыя Якаўлеўна **Баравік**,
г.п. Падсвілле.

У красавіку 1990 года савецкі ўрад афіцыйна прызнаў праўду пра злачынствы сталінскага рэжыму ў Катыні.

Вецер Праўды магутны! Дзьмі!
Асабліва, як дымам сцеліць...
Можа зоркі былі людзьмі,
Як з нябёс на Катынь глядзелі,
Як людзей вынішчалі людзі?..
Неба бачыла! Праўда судзіць!

У нармальнае чалавечае ўяўленне не ўкладваецца, што маглі, проста, перабіць людзей дзесяткамі тысяч, без выкліку арыстантаў і аб'яўлення віны, людзей, якія не зрабілі ніякага злачынства, а толькі выконвалі абавязак згодна распараджэння польскага ўраду – служылі там, куды іх паслалі.

Заходняй Беларуссю Масква заплаціла Польшчы за мір (згодна Рыжскай дамовы 18 сакавіка 1921 года. За 18 гадоў пад Польшчай у Глыбоцкім раёне вырасла мястэчка Кашары (сучаснае Падсвілле). Яно засталося як памяць пра тое, што мы былі здадзеныя Польшчы. Пасёлак жыве. А тыя, хто яго заснаваў, загінулі ў Катыні?.. Ды і ўсюды: у лесе, у чыстым полі, у прымежнай паласе, у 1939 годзе, як уцякалі польскія салдаты ад забойства іх савецкімі салдатамі...

– Маладзенькага салдаціка-паляка ў ніжняй бялізне бачылі каля лесу. Пакуль прыдумалі, як яго ратаваць, ён знік, — распавядае Клаўдзія Антонаўна, – ён жа не дабег вось так да Польшчы...

Гэта адна думка. А другая пра тое, што на пагібель гналі і беларусаў.

Жылі-былі Ціт і Фёкла. І ўсяго толькі год у шлюбе. Іх забралі з сямейнага дому ў Ластавічах 22 чэрвеня 1941 года. Фёклу не забілі. Але – маладосць і тую мару пра шчасце. А Цітава жыццё ўжо стаяла ў рэестры... Яго ў тоііі трагічнавядомы дзень павезлі спачатку ў Беразвецкі знішчальнік... А яе, Фёклу Ермалаеўну, на вакзал, і цягнікам – у Алтайскі край.

– Я вярнуся, – сказаў Ціт.

Ён не мог думаць іначш, бо чалавек божай веры, душа-невінаватасць, не ўяўляла такога насілля ад сваіх. Бо сусед жа Аўласаў служыў у НКУС.

Ціт Астаф'евіч Пракоф'еў вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі і быў настаўнікам славеснасці, Закону Божага ў школе. Ва ўмовах польскай акупацыі на тэрыторыі так званых Заходніх Крэсаў лічыўся афіцэрам запасу Войска Польскага і трапіў у лёсавы спіс Катынскай трагедыі. Службоўцы НКУС, мусіць, не паспелі зрабіць мясцовую прачыстку. Грымнула Вялікая Айчынная вайна. Ідуць фашысты, а тут – Ціт... Не расстраляны ў Катыні. Духоўнік, адукаваны, пражыў вунь колькі над уладай Польшчы, нібы зрыфмаваўся з ёй. ...Ён жа адразу зоймецца варожай дзейнасцю, да немцаў прыпаецца, здасць Германіі не толькі родныя Ластавічы, Глыбоччыну, але і Маскву. Браць яго! І жонку, гэтую "палячку" – далей ад фронту! Яна, хоць і залеская па нараджэнню, але расла ў атмасферы школьнага апалячэння, закончыла на выдатна сем класаў польскай школы. Вядома ж – вораг, знюхаецца з акупантамі.

Сама ж учынніца Саюза ніяк не лічыла сябе акупантам, хоць вельмі выразна праследжваецца ў гісторыі захоп, маніпуляцыя... Пачынаючы з 1 студзеня 1919 года наша Беларусь два тыдні пабыла Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай, пасля чаго ад БССР былі адарваны тэрыторыі Віцебскай, Смаленскай, Магілёўскай губерняў і ўключаны ў склад РСФСР – сталі Расеяй. Астатнія губерні з 28 лютага ўвайшлі ў марыянетку ЛітБел. А ўлетку ўжо яна зноў лічылася Расеяй.

І сталі ёй гандляваць. За дзве літоўскія дывізіі для ўдзелу ў вайне супраць Польшчы РСФСР аддала Літве 12 ліпеня 1920 года значную частку Беларусі. А 31 ліпеня на тэрыторыі толькі 18-ці паветаў зноў была абвешчана БССР.

На перамове ў Рызе 21 верасня 1920 года ўрад Масквы хацеў аддаць Польшчы ўсю Беларусь, але тая адмовілася ўзяць. І, урэшце, 18 сакавіка 1921 года, згодна Рыжскай мірнай дамовы, Масква аддала Польшчы ўсю Заходнюю Беларусь. Наша зямля стала для Расеі стратэгічнай прасторай –прыкрывала шлях на Маскву.

Пры Польшчы ў Беларусі нарадзіліся і выраслі, дасягнулі юнацкага ўзросту людзі – "палякі". Такой "палячкай" была Фёкла. Адно: яна ў польскасць трапіла ўжо чатырохгадовай дзяўчынкай.

Якая ж тады віна карэнных жыхароў зямлі беларускай, што яны чаргова траплялі пад тую ці іншую акупацыю і вымушаны былі ўжывацца з рознай уладай?.. Каб, проста, быць жывымі, мець пад нагамі грунт, дарогу. Рухацца... Якая розніца ўжо, куды... У капіталізм, сацыялізм, камунізм?.. Пры Сталіне маланкава рухаліся на той свет...

...Фёкла павінна была прыняць лёс выгнанніцы. Яе павезлі ў бітком набітым вагоне на далёкі Алтай. Ехала ў чужы невядомы свет часоў Вялікай Айчыннай вайны і не магла ведаць, што Ціт ужо забіты яшчэ на шляху да савецка-польскай мяжы ў Кублічы.

Ціт, як калона смертнікаў ішла праз Перадолы, папрасіў піць у Васі Пустыннікава, меньшага дваюраднага брата Фёклы. Але бацька хлопчыка – Яўсей зразумеў, што гэта за калона і адазваў сына, баючыся быць раскрытым у сваяцтве з арыштаваным. Ён ужо меў досвед... Сын Міша паддаўся на ружовы заклік з усходняй савецкай Беларусі, перайшоў мяжу з польскай тэрыторыі, каб трапіць у "светлае жыццё", абяцанае з таго боку. І знік. Яўсей ужо траціў сыноў. Які бацька не пабаіцца?

– Не высоўвайся! – сказаў Васілю.

Так Ціт і не напіў вады ў сваякоў.

Гэтыя і некаторыя падрабязнасці апошніх гадзін Цітавага жыцця выявіліся ў часе, далёка наступным... І тое, што загінула калона пад налётам нямецкіх самалётаў.

Ціту Астаф'евічу сёлета было б 100 гадоў. Можа б і дажыў, каб не цёмныя знішчальныя сілы сталіншчыны. А так засталася толькі памяць. Яна выразнейшая і сёння.

Я помню, помню, як цябе знішчалі:
Душу і цела, каб і сны маўчалі...
Каб ты знямеў і ў часе, і ў прасторы,
Каб ты не ведаў, што ёсць Бог і зоры...
Але Дух – несмяротны ў свеце Праўды.
Ён навальнічны там і ачышчальны,
Ён там іскрыцца проста, натуральна.
І думкі боскія свяціць пра гэта рады.

Думкі і словы Фёклы выразныя. Усё і цяпер добра памятае. Яна распавядае, як імкліва павезлі яе ў Алтайскі край:

"...Барнаул – на рацэ Обь. Нас пагрузілі ў баржу. Яна аж тануць стала. Тады перамясцілі ў другую... У Бійск плылі па рацэ Бія. А далей – на валах, 200 кіламетраў. Я – пешшу, бо маладыя ішлі. Начавалі на полі і зноў ішлі, да Тагола, дзе нас і размеркавалі, куды каго (у калгас, у Ямінск, частку ў тайгу). Я, якраз, і трапіла ўпачатку на лесапавал. Лес валілі на дровы. Жылі ў бараках. Асабліва было цяжка зімой. Ужо ў сакавіку мяне накіравалі на залатыя капальні. Стаяла на кантролі прамыўкі золата. Прымала выпрацоўкі ў вязняў. Золата збіралі ў банкі, апячатвалі і адпраўлялі ў Манголію. Маю шэсць гадоў залатой маладосці... На заканчэнні зняволення рэжым паслабілі. Ды і польскі ўрад хадатайнічаў увесь час. Ужо, калі перавялі на вольнае пасяленне, нам палягчэла. У Таголе я працавала ў вайсковай сталовай.

Фёкла Ермалаеўна вярнулася ў 1949 годзе, калі было дазволена раз'язджацца, як кажуць, па хатах.

– Былі б хаты, а то дзе іх знойдзеш, – згадвала яна пачатак сваёй волі, – я ж яшчэ не ведала, што ўсю нашу гаспадарку, сядзібу разбурылі начыста.

Маёмасць забралі. Невядома куды дзелася і багатая бібліятэка мужа... А пра яго думала, што жывы. Дамоў цягнула. А магла б ехаць у Польшчу. Некаторыя туды ехалі. Я ж добра ведала мову. Але адправілася на Радзіму з сям'ёй Зубко, якая вярталася ў Шылава. Я ж не адна была звезена на Алтай з Глыбоччыны."

Безумоўна. І прыехала Фёкла Ермалаеўна ў родны куток, і даведалася, што Ціта няма з пачатку вайны. А гэта быў прыстойны, адухоўлены Божай верай чалавек.

...У Залессі, адкуль родам, пазнаёмілася з Лявонам Мінаевічам Лазукіным. Іх лёсы падобныя. Толькі Лявона вывезлі ў Германію не "сваё", а немцы.

Лявон з жонкай і маленькім сынам Амбросам знясілелі ад голаду на працы ў германскім палоне. Жонка старалася карміць сына. Сама не вытрымала – памерла. Тады сына карміць стаў Лявон. Згаладаўся так, што, урэшце, знемогся і зваліўся з ног. Яго ўжо выкінулі былі да мёртвых. Але нехта (ёсць жа людзі добрыя ўсюды) разгледзеў, выратаваў. Знайшлася і праца. Сяк-так акрэйбаў. І сына не згубіў. Вярнуўся, як лёс пасадзейнічаў, у Залессе. Тут на трэці дзень пасля знаёмства з Фёклай, абручыліся...

У 1950 годзе нарадзілася Каця (па мужу Кір'янава). У 1954 – Коля (Мікалай Лявонавіч Лазукін). Пайшлі ўнукі, праўнукі...

Згубіцца гэтай Памяці няпроста –
Яна ўраслася ў пройдзеныя вёрсты,
Раскаранілася і дасягнула росту...
Згубіцца гэтай Памяці няпроста!

Вось толькі згубіўся Амброс, які выжыў у Германіі пад ахвярным бацькоўскім наглядам, вырас з дапамогай чулай душы Фёклы, і ў 1964 годзе пайшоў служыць вялікай Радзіме. І згубіўся. Без вестак.

– Мы яшчэ думалі, што падаўся, мабыць, пасля службы на будаўніцтва Краснаярскай ГЭС, – згадваюць брат і сястра. Ніхто пра яго не паведамляў. Толькі праз колькі гадоў несуцешных пытанняў прыйшло: "Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў у раёне каардынатнай сеткі праліва, цячэння "Новая зямля".

Гэта Паўночна ледавіты акіян. Там праходзілі выпрабаванні атамнай зброі.

Як жыцці трапляюць у мора,
Пра гэта ж усім не гавораць...
Хіба, можа, бачылі зоры...
Над морам?..
А вы ўжо мяне не чакайце,
А вы ўжо мяне не шукайце,
І бацька Лявон, і сям'я...
І маці, і Коля, і Каця...
Магіла мая – акіян.

Амброс?.. А як бы зласкавіла гэтае імя каханая дзяўчына? – чамусьці сумна падумалася мне, – Рося?.. Ці паспеў ён, нават, закахацца? Салдат Амброс...

Лявона Мінаевіча ўжо таксама няма на свеце. А Фёкла Ермалаеўна жыве. Трымаецца на 150 рублёвай пенсіі. Ёй 89 гадоў. Адметна, што нарадзілася 7 лістапада 1917 года. Прыйшла на белы свет у час суцэльнага націску. Праўда, у нас яшчэ, мабыць, яго так не адчувалася. Быў іншы – Польскі, культурна-памяркоўны. Ішло апалячванне беларусаў, ад якога і Фёкла "палячка" (дакументальна).

– Веды польскай школы дапамаглі выжыць у ссылцы, – кажа сын, – выратавалі ад непасільнацяжкай працы... Сярод ссыльных мама была найбольш адукаванай.

...І ўнутранае святло, пачуццё чалавечай годнасці, нейкі мяккі спакой, дабрыня жыве ў Фёкле Ермалаеўне. І Памяць.

Зацягвалі вузел болю
На ейным выгнанні з волі,
На сэрцы жывым, на долі.
На Памяці – не змаглі...
Бо памяць выгнання з волі
Праточыць падмуркі, столі,
І сцены святлом расколіць,
І знойдзе ў жыццё праліў...

У Задарожжы, недалёка ад касцёла, пахаваны ейны прапрадзед. Ён сабою зачаў клады на асабістай зямлі, якая пры Саветах была абагулена.

– Яшчэ стары дубовы крыж стаіць, – згадвае пра-пра-праўнук Мікалай.

Выразна адчуваю, што ў гэтым радаводзе жыве Памяць.

Падсвілле. Цвінтар.

Фота Ул. [illegible]

Вечныя манаскія шлюбы ў Докшыцах

■ Кастусь Шыталь
г. Докшыцы

27 снежня 2006 года ў докшыцкім касцёле Найсвяцейшай Тройцы два манахі-капуцыны - брат Андрэй Кваціцнскі і брат Алег Шэнда склалі вечныя манаскія шлюбы. Яны далі ўрачыстае абяцанне да канца сваіх дзён жыць у чыстасці, беднасці і паслухмянасці, наследуючы самога Езуса Хрыста і святога Францішка, заснавальніка манаскай супольнасці Меншых Братоў Капуцынаў. Шлюбы былі складзены перад віцэправінцыялам ордэна капуцынаў на Беларусі а. Марэкам Пасютам. На ўрачыстасць вечных шлюбаў сабралася шмат святароў, братоў-капуцынаў, а таксама вернікаў мясцовай парафіі.

Браты Алег Шэнда (злева) і Андрэй Кваціцнскі перад урачыстым складаннем вечных шлюбаў. *Фота Кастуся Шыталя.*

Ляжанне крыжам перад алтаром – абавязковы элемент такой урачыстасці. *Фота Касутся Шыталя.*

Напярэдадні гэтай падзеі аўтар гэтых радкоў сустрэўся з братам Андрэем Кваціцнскім, каб задаць яму некалькі пытанняў для "Вольнага Глыбокага".

(К.Ш.:) – *Якой была Вашая дарога да пакліканья? Што прымусіла Вас уступіць у ордэн капуцынаў?*

(бр. А. Кваціцнскі:) – Калі нараджаецца чалавек, у Бога ўжо гатовы для яго план. І толькі тады, калі ён рэалізуе гэты план так, як хоча Бог, то будзе шчаслівы. На працягу апошніх гадоў мы адкрылі, што нашае прызначэнне – гэта служба Богу. У нейкай ступені гэта служба народу - таму народу, у які мы будзем накіраваныя, незалежна ад таго, ці гэта будзе Беларусь, Польшча, ці, напрыклад, Афрыка. Пакуль што браты з Беларусі працуюць у большасці ў Беларусі, бо тут вялікія патрэбы. Наступствы дзесяцігоддзяў камунізму і духоўнае спустошэнне народа патрабуюць вельмі шмат працы: трэба працаваць з людзьмі, несці ім святло Евангелля. Мы будзем прыкладаць усе сілы, каб наступіла духоўнае адраджэнне народа.

Мая дарога паклікання была даволі цікавая. Напачатку жыццё рэлігійнае ў мяне асабіста было не вельмі глыбокім, у касцёл хадзіў мала. Але потым уздзеянне Бога было якоесьці асаблівае. Увогуле, кожнае пакліканне мае цікавую і непаўторную дарогу. Гэта проста якоесьці ўнутранае перажыванне, якую людскімі словамі вельмі цяжка акрэсліць.

(К.Ш.:) – *Ці складана было Вам адмовіцца ад простага, свецкага жыцця?*

(бр. А. Кваціцнскі:) – Калі Бог прызначыў для мяне менавіта такую дарогу, то маё шчасце будзе менавіта тут, у ордэне капуцынаў. Толькі тут я буду шчаслівым. І таму адмовіцца ад жыцця ў сям'і, якое для кагосьці таксама з'яўляецца Божым пакліканнем, прыгожым і ўзнёслым, не было для мяне цяжкім. Канечне, чалавек часам сумуе, але веданне таго, што я ахвяраваўся Богу і хачу належаць толькі Яму, дадае сілы.

Фотавітрына «Вольнага Глыбокага»

Дамы пад чарапічнымі дахамі – 1

■ Уладзімір Скрабатун

Мне згадваецца сярэдзіна 1980-ых гг. Я тады, па сканчэнню навучальнай установы і па "ўсесаюзнаму" размеркаванню, працаваў прарабам у Латвіі. Прыязджаю на колькі дзён у Глыбокае. Бачу афішу – "Свята вуліцы Маскоўскай". Месца правядзення свята была пляцоўка ў раёне ДОСААФ. Прыйшоў. На сцэну падняўся спадар Роммель, тады, здаецца, парторг мясакамбіната. Ён распавёў пра тое, як цяжка жылося глыбачанам пад прыгнётам польскіх паноў. Немагчыма, маўляў, было прайсці па горадзе без гумовых ботаў. Паўсюдна гразь па калена, лужыны і саламяныя стрэхі.

І мне прыгадалася, што абсалютна тое ж самае, на пяць гадоў раней, я чуў не ў Глыбокім, а ў Мінску. Вясновым днём 1977 года я, тады навучэнец Мінскага архітэктурна-будаўнічага тэхнікума, прыйшоў у рэдакцыю бюлетэня "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі" і прапанаваў свой артыкул "Глыбокае на старых паштоўках". Супрацоўнік рэдакцыі Ілля Клаз уважліва разглядзеў мой іканаграфічны матэрыял – каляровыя арыгіналы паштовак з відарысамі глыбоцкіх вуліцаў, храмаў, школы, пошты – і на ўсё гэта вельмі аўтарытэтна заявіў: "Такія здымкі мы не можам надрукаваць! Навошта. У вас да рэвалюцыі ў Глыбокім жылі лепш, чым цяпер! Дзеля чаго тады было рабіць рэвалюцыю? Паглядзіце самі, што вы нам прынеслі? Брукаваныя вуліцы, ходнікі, дамы крытыя дахоўкаю, людзі ў цыліндрах. Не! Такія здымкі мы апублікаваць не можам! Нам патрэбна, каб былі саламяныя стрэхі, пахілыя дамы, вокны забітыя дошкамі, гразь і лужыны на вуліцах..." І на развітанне, параіў: "Напішыце тэкст, а здымкі – мы самі знойдзем!". Рэдакцыя, па іроніі лёсу, знаходзілася ў Мінску па вул. Рэвалюцыйная, 13.

Працяг будзе.



г. Глыбокае. Пляц 3-га Траўня. 1930-ыя гг. Фота Леанарда Рачыцкага



г. Глыбокае. Пляц 17-га Верасня. Студзень, 2007 год. Фота Ул. Скрабатуна.

ЛІНІЯ РОСТУ

Сістэма зберажэнняў Белаграпрамбанка

Больш чым вы чакалі ад сваіх грошай!

www.belapb.by
белагропромбанк
традиции будущего

Выплата працэнтаў:

Штомесячна, па выбару кліента, шляхам:
- прылічэння да сумы ўклада (капіталізацыя)
- пераліку на рахунак, указаны ўкладчыкам
- выдача наяўнымі **

Дадатковы ўзносы:
- без абмежаванняў па максімальнай суме
- без абмежаванняў па перыядычнасці ўнясення.

Частковае зняцце:
- у межах астачы ўклада, які не зніжаецца*
- з пераразлікам працэнтаў па часткова патрабуемай суме за фактычны перыяд яе захоўвання, сыходзячы з 1/2 працэнтнай стаўкі, якая дзейнічае па ўкладу*

Аўтаматычнае павелічэнне працэнтнай стаўкі:
- пры павелічэнні рэшты ўклада да сумы, якая адпавядае іншаму памеру працэнтнай стаўкі
- пры падаўжэнні тэрміну захоўвання ўклада

Датэрміновае скасаванне:

З пераразлікам працэнтаў за фактычны перыяд захоўвання ўклада:
- зыходзячы з 1/2 працэнтнай стаўкі, якая дзейнічае па ўкладу*
- зыходзячы са стаўкі ўклада да запатрабавання**

Падаўжэнне тэрміну захоўвання:

Аўтаматычна пры не яўцы ўкладчыка да наступнага магчымага тэрміну захоўвання

*толькі для ўкладаў з плаваючай працэнтнай стаўкай; ** толькі для ўкладаў з фіксаванай працэнтнай стаўкай

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100	200	300	500	1000	2000	3000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100	200	300	500	1000	2000
Белорусские рубли													
1 - 1 000 000	9,50	10,50	12,00	13,50	14,00	14,50	15,00	7,50	7,80	8,10	8,40	8,70	9,00
1 000 001 - 10 000 000	10,00	11,00	12,50	13,75	14,25	14,75	15,25	7,60	7,90	8,20	8,50	8,80	9,25
10 000 001 и более	10,50	11,50	13,00	14,00	14,50	15,00	15,50	7,70	8,00	8,30	8,60	8,90	9,50
Доллары США													
1 - 500	4,00	5,50	7,00	8,00	8,50	9,00	9,50	4,00	5,00	6,00	6,50	7,00	7,50
501 - 5 000	4,50	6,00	7,50	8,25	8,75	9,25	9,75	4,50	5,50	6,25	6,75	7,25	7,70
5 001 и более	5,00	6,50	8,00	8,50	9,00	9,50	10,00	5,00	6,00	6,50	7,00	7,50	8,00
Евро													
1 - 500	4,00	5,50	7,00	8,00	8,50	9,00	9,50	4,00	5,00	6,00	6,50	7,00	7,50
501 - 5 000	4,50	6,00	7,50	8,25	8,75	9,25	9,75	4,50	5,50	6,25	6,75	7,25	7,70
5 001 и более	5,00	6,50	8,00	8,50	9,00	9,50	10,00	5,00	6,00	6,50	7,00	7,50	8,00
Российские рубли													
1 - 15 000	5,00	6,00	7,00	8,00	9,00	10,00	10,50	5,00	5,50	6,00	6,50	7,00	8,00
15 001 - 150 000	5,50	6,50	7,50	8,50	9,50	10,25	10,75	5,25	5,75	6,25	6,75	7,50	8,50
150 001 и более	6,00	7,00	8,00	9,00	10,00	10,50	11,00	5,50	6,00	6,50	7,00	8,00	9,00

*** Гэтыя стаўкі ўжываюцца:**

для дагавораў тэрміновага банкаўскага ўклада (дэпазіта) з плаваючай працэнтнай стаўкай, якія заключаны ў перыяд з 06.03.2006 г. да 01.01.2007 – з 01.02.2007;
для дагавораў тэрміновага банкаўскага ўклада (дэпазіта) з плаваючай фіксаванай працэнтнай стаўкай, якія заключаны з 01.01.2007 г.

За моцную сям'ю і трывалы шлюб

Агульнавядома, калі ў сям'і лад і згода, то ўсе жыццёвыя цяжкасці, якіх, на жаль, хапае ў нашым жыцці, пераадольваюцца значна лягчэй. Сям'я - гэта ячэйка грамадства, і чым мацней ячэйка, тым мацней грамадства.

Яўген Самсонаў, *тэкст і фота*

Аўтар гэтых радкоў сумесна з начальнікам аддзела ЗАГС Глыбоцкага райвыканкама Валянцінай Вайцехаўнай Саковіч пазнаёміць чытачоў газеты "Вольнае Глыбокае" са статыстычнымі дадзенымі, чытачы атрымаюць адказы на розныя хвалюючыя пытанні, пазнаёмяцца з цікавымі і павучальнымі гісторыямі з сямейнага жыцця. Будзем разам! Спадзяёмся на вялікую актыўнасць чытачоў, бо ў кожнага з нас былі розныя неардынарныя сітуацыі – цікавыя і захапляючыя, жартоўныя і наадварот, вельмі сумныя. На жаль, здараюцца ў жыцці такія выпадкі, калі закаханы чалавек становіцца ахвярай мярзотніка ці драпежніцы, якія спекулюючы і топчучы святыя і светлыя пачуцці, нахабна выкарыстоўваюць іх у сваіх карысных мэтах.

Выліць душэўны боль, які доўга носіць чалавек у сваім сэрцы – тэма далікатная, таму ананімнасць гарантуецца. Будзем задаволены, калі магчыма гэта рубрыка пасадзейнічае каму-небудзь з чытачоў разабрацца ў заблытаных жыццёвых становішчах, дапаможа быць пачутымі і зразумелымі іншымі, бо паразуменне і раўнавага – вялікія жыццёвыя каштоўнасці.

На здымку: начальнік аддзела ЗАГС Глыбоцкага райвыканкама Валянціна Вайцехаўна Саковіч.

Мая жыццёвая пазіцыя застаецца ранейшай

Завяршыліся эмацыянальныя ўсплескі з нагоды выбараў у мясцовыя саветы. Кандыдатам у дэпутаты ў Глыбоцкі раённы савет народных дэпутатаў па Мінскай выбарчай акрузе №7 быў і аўтар гэтых радкоў. Вельмі ўдзячны сваім выбаршчыкам, якія мяне падтрымалі. Асабіста Віктару Бахіру, Людміле Ільінчык і іншым выбаршчыкам, якія мяне падтрымалі і дапамаглі выявіць парушэнне: замест бюлетэняў, у якіх было маё прозвішча і прозвішча майго апанента, ім выдаваўся бюлетэнь з прозвішчамі іншых кандыдатаў у дэпутаты. Аб гэтым парушэнні аўтар гэтых радкоў напісаў заяву ў адпаведную інстанцыю.

Згодна вынікаў падліку галасоў участковай выбарчай камісіяй участка для галасавання №3, дэпутатам раённага савета стаў Максім Леанідавіч Гірдзюк. Ён набраў на 58 галасоў больш, з чым яго і віншую. З 798 выбаршчыкаў Мінскай выбарчай акругі №7 па г. Глыбокае прынялі ўдзел у галасаванні 460 грамадзян, за М. Л. Гірдзюка аддалі галасы 210 выбаршчыкаў, за Я. Р. Самсонава – 152 галасы.

Мая жыццёвая пазіцыя застаецца ранейшай – я гатовы дапамагаць людзям у любой сітуацыі, быць мастом паразумення паміж уладай і кожным грамадзянінам, незалежна ад яго веравызнання, перакананняў і партыйнай прыналежнасці. Звяртайцеся. Будзем разам!

З павагай Я. Самсонаў

Ёсць што прапанаваць

На "Мінскім мэблевым салоне" у мінулым годзе сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю **ЗОВ-ЛенЕўрамэбля"** атрымала дыплом "За забеспячэнне беларускага рынку якаснымі таварамі", у **гэтым годзе** перамагло ў намінацыі "Суадносіны кошту і якасці", некалькі год запар на конкурсах на лепшага прадпрымальніка прызнаецца такім ў Гродна, вобласці і краіне, мае шматлікія ўзнагароды прэстыжных міжнародных выстаў і, галоўнае, прызнанне пакупнікоў.

Сёння інвестыцыйныя праекты гродзенскіх вытворцаў мэблі падтрымліваюць расійскі, польскі, нямецкі, ізраільскі, італьянскі капіталы. Ім ёсць што прапанаваць пакупніку. Ды куды ж больш новыя і разнастайныя! Матэрыялы – ад натуральнага дрэва і знакамітай сціплай ДСП да сучасных МДФ, пастформінгу, сартформінгу. З МДФ для фасадаў кухні прапануюць тут: МДФ фарбаваны (матавы і перламутравы); МДФ рамачны, можна з рознымі ўстаўкамі ці без іх; пакрыты плёнкай ПВХ усіх колераў вясёлкі.

Шкло празрыстае, "пад бронзу", рыфлёнае, шклопескаструй, з вітражамі, можна з тымі і іншымі, ды яшчэ ў алюмініевай рамцы ці...

Арыгінальная фурнітура і аксэсуары, неабмежаваныя магчымасці дызайнерскіх рашэнняў ад "добрапарадкавай класікі да мадэрну" дазваляюць сёння ЗОВ-ЛЕНЕўрамэбля выпускаць каля тысячы розных фасадаў кухні, у якіх не знойдзецца "блізнят"!

Модульная сістэма з некалькіх дзесяткаў навясных шаф (вітрын, сушак, пеналаў) і не меншай колькасці шаф-сталоў(сталоў-паліц, шуфляд, бутэлечніц і г. д.), якія стыкуюцца адзін з адным, дае магчымасць пакупніку выбраць патрэбныя і скласці асабістую мэблевую кампазіцыю, якая ўпісваецца ў асаблівасці жылля, яго памеры і густ. Прамысловая, пастаўленая на паток вытворчасць, стварае ў выніку ілюзію штучнага, непаўторнага тавару.

Шырока выкарыстоўваюцца модулі і ў вырабе корпуснай мэблі – сценак, якія выпускае ЗОВ-ЛенЕўрамэбля. Асартымент іх здаецца, невялікі – 9 "з імёнамі" ("Данііл", "Оскар", "Вікторыя") і... модульная сістэма "XXI стагоддзе" з 20 базавых элементаў. Яна дае множства варыянтаў для афармлення інтэр'еру!

Калі карацей: сёння прадпрыемства "ЗОВ" вырабляюць усё, што ёсць на беларускім мэблевым рынку і тое, чаго ў іншых няма. Напрыклад, няма аналагаў сценцы "Мілена" з гнутым акруглым шклом. На жаль, гэту шматколерную прыгажосць можна ўбачыць толькі ў каталогах і на сайце – выставачныя ўзоры.

Акрамя кухань, сценак, яны вырабляюць шафы, сталы, стулы, абедзенныя зоны, прыхожую.

Заказаць гэтую мэблю можна і ў нас па адрасу: **г. Глыбокае, вул. Леніна, 44, гандлёвы цэнтр "Для Вас".**

Вырабім вокны і дзверы з ПВХ, балконныя рамы.
Нядорага
Тэл.: 8(029) 342-91-94; 573-95-73; 8(01773) 2-94-90
Пасв.№590337765 ад 24.12.03 Смаргонскім РВК

СТО ЧУП "Авто-Забота"
*Аўтарамонт — Штодня: з 8.00 да 18.00 акрамя нядзелі
* Развал-схаджэнне * Зварачныя работы
* Падрыхтоўка, афарбоўка, падбор фарбаў, паліроўка — на вул. Прамысловая, 15

Новая паслуга: рамонт стартэраў і генератараў. Прамыўка інжэктараў, карбюратараў
Дырэктар: 517-20-53; 662-70-65; 299-13-64
Стол заказаў: 2-65-94
Бухгалтар: 712-26-76
Ліц.:№390389856, выд. 22.03.06,Віцебскім АВК

Футбольны бум і не толькі

У Паставах пражывае крыху больш за 20 тысяч жыхароў. Аднак у горадзе ёсць дзве каманды майстроў. У першай лізе чэмпіянату краіны гуляе валейбольны "Атлант-М", а ў другой – футбольны ПМЦ. – Абодва калектывы ўзніклі не на пустым месцы, штучна ніхто не ствараў, – адзначыў карэспандэнту начальнік аддзела па фізкультуры, спорту і турызму райвыканкама Васіль Захарэвіч. – У раёне моцныя валейбольныя традыцыі, працуе аддзяленне ў ДЮСШ, шмат хто цікавіцца гэтай гульнёй. І лепшыя спрабуюць сілы ў чэмпіянаце краіны. А футбол актыўна развівае мэблевы цэнтр.

■ **Уладзімір Абрамовіч**

Дарэчы, восенню ў Паставах нават прайшоў міжнародны матч. Гулялі ветэраны футбола горада і каманда замежных спартсменаў Еўропы, сярод іх быў праслаўлены Сяргей Алейнікаў. Футбол перажывае ў Паставах бум. Хаця ўсе гаварылі журналісту, што бум яшчэ наперадзе. Мэблевы цэнтр пачаў будаваць футбольны комплекс, куды ўвойдуць два полі з травяным пакрыццём і адно са штучным. Таксама збіраюцца ўзвесці і свой ФАК. Рэгулярна праводзяцца турніры па міні-футболу сярод дзіцячых каманд. Кіраўнікі прадпрыемства і клуба маюць намер расціць свае таленты, таму ўжо зараз праглядаюць мясцовая дараванні.

Але вялікі спорт – гэта вяршыня. У раёне ў апошні час шмат увагі надзяляецца стварэнню спартыўнай базы. Дзейнічае звыш 130 спартыўных збудаванняў, а пастаянна спортам займаецца звыш пяці тысяч чалавек. Цэнтрам спартыўнай работы ў рэгіёне, без сумневу, стаў гарадскі фізкультурна-аздараўленчы камбінат. Зразумела, у сталіцы можна пабачыць збудаванні больш значныя, аднак для райцэнтра гэта вельмі салідны аб'ект. Прычым, шмат чаго тут зроблена рукамі энтузіястаў. Васіль Захарэвіч і яго калегі самі і цэглу клалі, і тынкавалі, і вагонку прыбівалі... За дарма. Больш таго, многія будматэрыялы набывалі за свае грошы.

Комплекс не пустуе. Тут праводзяць зборы каманды майстроў па валейболу Рэспубліканская вучылішча алімпійскага рэзерву, гомельскі ГВК і жлобінскі "Металург", і глыбачане.

